Пролетарыі ўсіх краін, аднайцеся!

# ЗАРА

орган Брэсцкага абкома КП(б)Б і аблвыканкома

№ 153 (225) | Аўторак 9 ліпеня 1940 г. | Цана 10 кап.

## Бюро Выканкома Індыйскага Нацыянальнага Кангрэса патрабуе неадкладнага стварэння народнага ўрада

НЬЮ-ЙОРК, 8 ліпеня. (ТАСС). Агенцтва Асошыэйтэд Прэс перадае, што Гандзі і члены Выканкома Індыйскага Нацыянальнага Кангрэса зноў паўтарылі рашучае патрабаванне прадаставіць поўную незалежнасць Індыі і неадкладна стварыць народны ўрад.

## Страты англійскага флота ў час сражэння ў Оране

НЬЮ-ЙОРК, 8 ліпеня (ТАСС). Агенцтва Юнайтэд Прэс паведамляе, што англійскі флот панёс цяжкія страты пры сражэнні ў Оране. Значна пашкоджан лінейны крэйсер „Худ" вадазмяшчэннем у 42 тысячы тон. Два эсмінцы затанулі.

## Прэзідэнт Фінляндыі ратыфікаваў совецка-фінляндскі гандлёвы дагавор

ХЕЛЬСІНКІ, 7 ліпеня (ТАСС). Па паведамленню газеты „Уусі суомі" прэзідэнт Фінляндыі прапанаваў сойму ратыфікаваць совецка-фінляндскі гандлёвы дагавор. Адначасова выдан указ аб уступленні ў сілу гэтага дагавора з 1 ліпеня гэтага года.

Прэзідэнт унёс таксама прапанову аб павелічэнні гарантыраваных экспартных крэдытаў з 200 мільёнаў да 1 мільярда фінскіх марак у сувязі з тым, што совецка-фінляндскі дагавор прадугледжвае значнае павелічэнне фінляндскага экспарта.

# УБРАЦЬ УРАДЖАЙ ДА АДЗІНАГА ЗЯРНА

Уборка — адна з працаёмкіх работ у сельскай гаспадарцы, яна у канчатковым выніку вырашае лёс ураджаю. На нарадзе перадавых камбайнераў і камбайнерак з членамі ЦК ВКП(б) і ўрада ў 1935 годзе таварыш Сталін гаварыў: „Уборка — справа сезонная і яна не любіць чакаць. Убраў своечасова — выйграў, опазніўся ва ўборцы— прайграў". Вось чаму ўборачныя работы трэба падпарадкаваць галоўнай рашаючай задачы — убраць хлябы ў кароткія тэрміны і без страт.

Гарачае надвор'е, якое стаіць у апошнія дні, паскорыла паспяванне азімага жыта. У вёсцы Старае Сяло, Цюхініцкага сельскага совета, Брэсцкага раёна, ужо выбарачным парадкам пачалося жніво. У другіх раёнах вобласці таксама распачынаецца ўборка азімах.

Перад партыйнымі і непартыйнымі большэвікамі вобласці стаіць задача — не адцягваць пачатак уборкі ні на адзін дзень, убіраць хлеб выбарачным парадкам, па меры выспявання яго на паасобных участках, скарыстаць на ўборцы поўнасцю ўсе ўборачныя сельскагаспадарчыя машыны і рабочыя рукі.

Ужо даўно вядома правіла, што сельскагаспадарчыя машыны аблягчаюць працу на ўборцы і малацьбе, забяспечваюць правядзенне жніва і абмалоту у самыя сціслыя тэрміны. Не разумеюць гэтага, як аказваецца, многія кіраўнікі нашых раённых земельных аддзелаў і Сельснабзбыта. На складах Сельснабзбыта ў гор. Брэсце працягваюць ляжаць 5 конных касілак, 19 конных грабель, 36 сартыровак № 5, 36 сартыровак № 2, 11 трыяроў. Усе гэтыя машыны размеркаваны па раёнах, але завоз іх у калгасы не арганізаван. Абласны земельны аддзел не кантралюе завоз машын у раёны і калгасы і таму атрымліваюцца такія рэзультаты.

Дрэнная работа некаторых МТС вялікай небяспекай пагражае своечасовай уборцы ўраджаю. У Маларыцкім раёне яшчэ не адрамантаваны 4 трактарных малатарні, у Пружанскім і Жабінкаўскім па 3 малатарні і ў інш. раёнах. Па 18 МТС не адрамантаван 31 трактар. Рамонт трактароў і малатарняў трэба безадкладна арганізаваць так, каб праз 3—5 дзён кожная машына магла-б быць гатовай да прадстаячай вялікай работы. У калгасах, дзе будзе праводзіцца машынная ўборка хлябоў, трэба зараз-жа паклапаціцца аб падборы і падрыхтоўцы ўчасткаў.

Правільная арганізацыя працы, стопроцантны выхад на работу ўсіх працаздольных калгаснікаў і спалучэнне ручной уборкі з уборкай машынамі — зарука поспеху ў рабоце. Перадавыя калгасы нашай краіны разумеюць, што чым лепш будзе арганізавана ўборка, тым менш будзе страт і таму яны адразу бяруць такі тэмп у рабоце, які дазваляе правесці жніво хутчэй.

„Трэба пайсці на тое, — пісала газета „Правда" 6 ліпеня, — каб ва ўсіх калгасах устанавіць парадак, пры якім у першыя 15 — 20 дзён уборкі і абмалоту хлябоў усім калгаснікам, занятым на абслугоўванні камбайнаў, на касавіцы простымі машынамі і ўручную, на вязцы, укладцы, возцы снапоў, на скірдаванні хлеба і саломы, на падграбанні калоссяў, на зернаачыстцы і ўсіх работах па абмалоту, налічваць працадні ў двайным размеры супроць існуючых расцэнак, у тым выпадку, безумоўна, калі выконваецца дзённая норма".

Партыйныя і совецкія органы ў раёнах абавязаны строга сачыць за выкананнем калгаснага статута як у часці авансавання калгаснікаў і выхаду ўсіх працаздольных на работу, так і ў часці разлікаў калгасаў з дзяржавай па абавязковых пастаўках.

Калгасы павінны строга прытрымлівацца ўстаноўленых на час уборкі, да выканання плана загатовак, норм авансавання ў размеры 10 процантаў ад фактычна намалочанага зярна, выключаючы абмалот з пасенных участкаў. Работа ў полі ў час уборкі павінна праходзіць увесь поўны дзень, з тым, каб убраць ураджай хутка і да адзінага зярна. Дэзарганізатары сельскай вытворчасці павінны атрымліваць рашучы адпор. З першага абмалоту, зярном высокай якасці разлічвацца з дзяржавай па зернапастаўцы. Выканання гэтых правіл патрабуюць інтарэсы нашай совецкай дзяржавы, інтарэсы ўсіх нашых калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў.

Падпіска на пазыку Трэцяй Пяцігодкі (выпуск трэцяга года) на Мінскім радыёзаводзе. Брыгадзір жаночай брыгады будаўнікоў Н. І. Юшчэнка падпісваецца на пазыку ў размеры месячнага заработка.

Фота І. Шышко. (Фотохроніка БЕЛТА).

Актывістка арганізацыі падпіскі на пазыку сярод калгаснікаў сельскагаспадарчай арцелі імені Молатава (Брэсцкі раён), калгаспы рахункавод Е. Г. Панько, прымае падпіску ў стаханаўкі Веры Дабінскай.

Фота В. Лупейко. (Фотахроніка БЕЛТА).

## ХОД ПАДПІСКІ НА ПАЗЫКУ ТРЭЦЯЙ ПЯЦІГОДКІ (ВЫПУСК ТРЭЦЯГА ГОДА) ПА БРЭСЦКАЙ ОБЛАСЦІ НА 7 ЛІПЕНЯ

Кожны дзень у абласное кіраўніцтва дзяржаўнымі ашчаднымі касамі і дзяржаўным крэдытам паступаюць зводкі аб ходзе падпіскі на Пазыку Трэцяй Пяцігодкі (выпуск трэцяга года) па раёнах вобласці.

На 7 ліпеня падпісаліся на пазыку 146.484 чалавекі на суму 15 мільёнаў 471 тысяча рублёў. У гэтым ліку ахвачана падпіскай рабочых і служачых 44.643 чалавекі, сялян - калгаснікаў і аднаасобнікаў ахоплена падпіскай 101.841 чалавек.

Вялікую частку сваёй падпіскі сяляне ўносяць наяўнымі грашмі. На 7 ліпеня ў дзяржаўную ашчадную касу паступіла наяўнымі 855 тысяч рублёў.

Наперадзе ў нашай вобласці па падпісцы на пазыку ідзе Кобрынскі раён. У гэтым раёне ахоплена падпіскай рабочых і служачых 3.343 чалавекі, сялян 5.243 чалавекі. Агульная сума падпіскі па раёну дасягнула 929 тысяч рублёў, з якіх наяўнымі ўнесена 106 тысяч рублёў.

Не адстае і Пружанскі раён. У ім ахоплена падпіскай на пазыку 10.548 чалавек на суму 1 мільён 642 тысячы рублёў. Наяўнымі грашмі ўнесена 86 тысяч рублёў.

Бармін.

## *Лікуючы Антопаль*

Актыўна і арганізавана праходзіць падпіска на пазыку ў Антопальскім раёне. Па ўсіх прадпрыемствах, установах, сельсоветах, калгасах і вёсках былі праведзены многалюдныя мітынгі. На мітынгах выступалі рабочыя, служачыя, члены прамарцеляў, калгаснікі, аднаасобнікі і працоўная інтэлігенцыя. Усе аднадушна адобрылі пастанову ўрада аб выпуску пазыкі.

Праз дзве-тры гадзіны на 1 ліпеня ўжо было 2000 падпісчыкаў. Выступленні мясцовага актыва на мітынгах характарызуюць выключны пад'ём працоўных горада і вёскі.

На многалюдным мітынгу ў Антопалі выступіла 11 чалавек. 60-гадовы селянін Сташэвіч Даніла заявіў:

—Гэта пазыка сапраўды пойдзе на ўмацаванне нашай сацыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян. Паны прымушалі нас падпісвацца на пазыкі. Грошы яны прапівалі ў рэстаранах.

Выступае шавец Кондар Моўша. З вялікай нянавісцю ён гаворыць аб польскіх панах, якія для яў рэйскага насельніцтва рабілі толькі адно — пагромы.

— Я з радасцю, — гаворыць тав. Кондар, — падпісваюся на пазыку, якая пойдзе на палепшанне культурна-бытавых умоў працоўных.

Узорную работу паказалі агітатары, якія растлумачвалі насельніцтву значэнне пазыкі. Агітатар тав. Вольскі з вёскі Непрабарачкі, Камень-Шляхецкага сельсовета, ахапіў падпіскай усіх сялян гэтай вёскі на суму 1025 рублёў. Падпісчыкі тут-жа, на месцы, ўнеслі ўсю суму наяўнымі грашмі.

Добра работаў актыў агітатараў Першамайскага сельсовета. Таварышы Бабко Іосіф, Мурашка Нікалай і другія падпісаліся на пазыку па 100 рублёў і поўнасцю ўнеслі наяўнымі грашмі. Яны ахапілі 100 процантаў усяго насельніцтва падпіскай на пазыку. Сяляне Першамайскага сельсовета падпісаліся на пазыку на суму 11.515 рублёў, наяўнымі грашмі ўнеслі 7.170 рублёў.

Падпіска на пазыку па раёну выявіла новых актывістаў з мясцовых жыхароў.

Так, таварышы Якімовіч Фёдар, Новасад Сцяпан (Дзеткаўскі сельсовет), Дударук Нікалай, Губінскі Іван (Камень-Шляхецкі сельсовет), Алешко Осіп (Талкоўскі сельсовет) і другія актыўна ўдзельнічалі ў растлумачальнай рабоце па ахопу насельніцтва падпіскай на пазыку.

М. Вайнер.

## Заканчваюць падпіску

Паспяхова заканчвае падпіску па Пазыку Трэцяй Пяцігодкі (выпуск трэцяга года) калектыў рабочых і служачых Гайнаўскага лесазавода імені Варашылава. Рабочыя і служачыя з радасцю даюць свае збераўленні ў пазыку дзяржаве.

Першымі, яшчэ 2 ліпеня ў 8 гадзін раніцы, закончылі падпіску рабочыя і служачыя корпуса № 5.

Усяго па заводу падпіскай на пазыку ахоплена 1983 чалавекі на агульную суму 320 тысяч 475 рублёў.

Не ахоплена падпіскай на пазыку толькі нязначная частка рабочых і служачых, якія знаходзяцца ў дамах адпачынку. Ад іх штодзённа паступаюць пісьмы і тэлеграмы, у якіх яны адабраюць пастанову ўрада аб выпуску пазыкі і ўказваюць суму сваёй падпіскі.

М. Шур.

## Усе ахоплены падпіскай

З асаблівай актыўнасцю прайшла падпіска на Пазыку Трэцяй Пяцігодкі (выпуск трэцяга года) сярод работнікаў Кобрынскага раённага аддзялення Рабоча-Сялянскай Міліцыі. Праз дзве гадзіны пасля перадачы па радыё паведамлення аб выпуску пазыкі ўвесь калектыў быў ахоплены падпіскай, якая складае 101 процант да фонда месячнай заработнай платы.

Шыршыкоў,
Анціпаровіч,
Ганчарова,
Камісія садзейнічання дзяржаўнаму крэдыту.

## НАРАДА ПА ПЫТАННЮ АГІТАЦЫЙНАЙ РАБОТЫ

**5 ліпеня Камянецкі райком КП(б)Б правёў нараду па пытанню аб становішчы агітацыйнай работы і аб дальнейшых задачах. Нарада была вузкая (прысутнічала ўсяго 9 агітатараў з вёсак), адкан удзельнікі нарады ўзнялі рад сур'ёзных пытанняў, якія з'яўляюцца актуальнымі для другіх раёнаў. Нізкі прыводзім некаторыя найбольш характэрныя выступленні на гэтай нарадзе.**

### АГІТАТАРЫ СЛАБА ПАДРЫХТАВАНЫ ДА РАБОТЫ

**Грудовік—агітатар в. Нікалаева**

Рэзультаты агітацыйнай работы па нашай вёсцы зусім недастатковыя. Гэта паказала і работа па рэалізацыі дзяржаўнай пазыкі. Назначаемыя сходы або зусім не адбываюцца, або праходзяць без належнай актыўнасці. Падпіску на пазыку праводзілі толькі шляхам падворнага абходу. Сума падпіскі складае 2.250 рублёў, што з'яўляецца зусім недастатковым для нашай вёскі. Справа ў тым, што агітатары ў нас зусім слабыя, а з раёна кваліфікаваныя дакладчыкі бываюць рэдка, хоць мы знаходзімся на адлегласці чатырох кілометраў ад раённага цэнтра. А варожыя элементы актыўна вядуць падрыўную работу.

### СІЛА АГІТАТАРА Ў ЯГО ПЕРАКАНАНАСЦІ

**Мельнічук—агітатар в. Кругель**

З першых дзён устанаўлення совецкай улады я аддаўся рабоце з масамі. Актыўна працаваў у час выбарчай кампаніі, выбары прайшлі добра. Таксама і падпіска на пазыку. Вёска Кругель, у параўнанні з іншымі вёскамі, эканамічна менш моцная. Але людзі падпісваліся ў нас ад шчырага сэрца. Работа наша нялёгкая: маса яшчэ адсталая, мне самому цяжка адарваць многа часу ад работы па гаспадарцы. Але работаў і работаю. І я магу сказаць, што калі агітатар добра сам разумее палітыку совецкай улады, перакананы ў непераможнай сіле комунізма, ніякія труднасці яго не могуць зламіць. Ён даб'ецца выканання пастаўленых задач. Сам я рэгулярна чытаю газету „Зара", кнігі па гісторыі ВКП(б), „Пытанні ленінізма".

### АГІТУЮ КАНКРЭТНЫМІ ФАКТАМІ

**Бандарук—агітатар в. Навічкавічы**

Раскажу, як я праводзіў падпіску на пазыку. Я агітаваў на канкрэтных фактах. Расказаў проста аб пажары другой імперыялістычнай вайны, якім ахоплен увесь капіталістычны свет, аб мірнай палітыцы совецкай улады. Паказаў, што сродкі ад пазык у СССР ідуць на абарону краіны і на тое, каб зрабіць жыццё працоўных больш шчаслівым. Гаворачы аб ахове здароўя працоўных у Совецкім Саюзе, прывёў такі прыклад: мая маці доўга хварэла, на ўрачоў затрацілі пры панскай уладзе 200 злотых і яе не вылечылі. Зараз я вазіў яе ў Беласток, там яе бясплатна лячылі, яна паправілася. Такая агітацыя зразумела кожнаму селяніну і яна дае добрыя вынікі.

### ЗРАБІЦЬ АГІТАЦЫЙНУЮ РАБОТУ БОЛЬШ РОЗНАСТАЙНАЙ

**Афанасьеў—кіраўнік агіткалектыва Шчэрбаўскага сельсовета**

У нашай рабоце ёсць сур'ёзныя недахопы. Ад райкома партыі патрабуецца значна павысіць якасць кіраўніцтва агітацыйнай работай. Мала ўказаць кіраўнікам агіткалектываў тэматыку, або час ад часу рабіць інструкцыйны даклад, трэба грунтоўна распрацаваць метадычныя пытанні, як у рабоце з агітатарамі, так і ў рабоце з насельніцтвам. Няма яшчэ ў нашых калектывах прадуманых планаў работы.

Яшчэ горш мы працуем з агітатарамі. Многія з іх вельмі жадаюць працаваць, але не маюць элементарных ведаў і часам даюць няправільныя адказы на пытанні сялян. Трэба, па маёй думцы, увесці сістэму ў рабоце з агітатарамі, даць ім мінімум ведаў па эканамічнай геаграфіі, паказаць багацці нашай краіны, расказаць, чым яна была і чым стала.

Трэба агітацыйную работу зрабіць больш рознастайнай. Сялян цікавяць многія пытанні: і наша судаўстройства, законадаўства па розных пытаннях, пытанні медыцыны, агратэхнікі. Чаму-б нам не прыцягнуць нашу інтэлігенцыю для чытання цыкла лекцый па гэтых пытаннях? Заняткі семінараў трэба праводзіць часцей, сістэматычна абменьвацца вопытам работы. Агітатараў трэба забяспечыць літаратурай. Неабходна пакончыць з цякучасцю ў самым складзе агітатараў.

### УЗМАЦНІЦЬ ІНДЫВІДУАЛЬНУЮ АГІТАЦЫЮ

**Гутараў—кіраўнік агіткалектыва Рэчыцкага сельсовета.**

Работа па размяшчэнню пазыкі паказала, што самая даходчывая і самая дзейсная форма агітацыі — гэта агітацыя індывідуальная. А між тым мы яе недаацэньваем. Калі прыедзеш у вёску, сустракаеш сялян, якія вечарамі збіраюцца групамі і гутараць на ўсялякія тэмы. А вось нашых агітатараў рэдка сустрэнеш сярод іх.

Трэба нам навучыць нашых агітатараў складаць план гутаркі, як праводзіць громкую чытку, навучыць іх карыстацца літаратурай.

Сур'ёзнейшы недахоп у нашай рабоце — адсутнасць работы з жанчынамі. У Турнянскім і Рэчыцкім сельсоветах не раз прышлося заўважыць, што і да гэтага часу жанчын нават не запрашаюць на агульныя сходы, а калі і прыдуць некаторыя — не лічаць сябе роўнапраўнымі. Няма ў нас зусім жанчын-агітатараў. Недапушчальна запусцілі мы і работу з моладдзю.

Хачу падкрэсліць, што мы яшчэ не разгарнулі па сапраўднаму культурную работу на вёсцы. Няма ў вёсках радыё, не прыстасоўваем памяшканняў для культурнай работы. У вёсцы Гурыны сяляне па сваёй ініцыятыве пабудавалі нядрэнны клуб са сцэнай. І вось зараз работнікі сельпо надумаліся заняць оцэну пад краму.

### СЯЛЯНЕ ПАДТРЫМЛІВАЮЦЬ МЕРАПРЫЕМСТВЫ СОВЕЦКАЙ УЛАДЫ

**Раманюк — агітатар в. Горы.**

Я працую ў сялянскім камітэце і работаю агітатарам з першых дзён вызвалення Заходняй Беларусі. І магу сказаць, што не было такога мерапрыемства, на якое не адгукнуліся-б нашыя сяляне. Трэба толькі правільна растлумачыць людзям і арганізаваць іх.

Так, мы дружна прадалі дзяржаве хлеб, мяса, ездзілі ў лес, працавалі на канале. Чесна і добра правялі веснавую сяўбу. Скасілі сенажаці, рыхтуемся да ўборкі ўраджаю.

Падпіска на пазыку прайшла у нас дружна. Быў такі выпадак, калі адзін селянін стаў гаварыць, што яму многа прыходзіцца плаціць. Ведаючы яго гаспадарку, я яму лёгка падлічыў, што ён плоціць зараз ва многа раз менш, чым плаціў раней. Жонка і дзіця гэтага селяніна нядаўна лячыліся ў совецкай больніцы і, вядома, бясплатна. Калі я яму ўсе гэтыя факты напомніў, ён са мной поўнасцю згадзіўся.

У нас вёска невялічкая, але арганізаваная. Кожны двор выпісвае газеты. Збіраемся часта і разам чытаем, тлумачым. Усе нашы сяляне выказваюць жаданне арганізавацца ў калгас.

Сяляне—і мужчыны і жанчыны —указваюць, што ў святочныя дні не арганізоўваюць для нас культурных мерапрыемстваў. Чаму-б не паладзіць упядзелю кіносеансы для вёскі днём? Мы-б арганізавалі людзей і калектыўна прыходзілі-б у кіно.

## ШТО МЫ ПАКАЖАМ НА РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЗЕ

У заходніх абласцях Беларусі ўпершыню ў гэтым годзе праводзіліся алімпіяды дзіцячай творчасці. Яны былі названы: першая гарадская, раённая і абласная.

У паказе дзіцячай мастацкай творчасці прынялі ўдзел 18 раёнаў. 7 тысяч навучаючыхся дэманстравалі сваё мастацтва. З вялікай любоўю дзеці аднеслісся да мастацкай творчасці. Асноўная мэта заключалася ў выяўленні і прапагандзе дзіцячай мастацкай самадзейнасці і прыцягненні шырокай грамадскасці да пытанняў мастацкага выхавання дзяцей. Перад мастацкім кіраўніком была пастаўлена складаная і адказная задача. Дзеці заходніх абласцей, як і ўсёй нашай краіны, павінны выхоўвацца ў комуністычным духу. Мастацтва павінна быць прасякнута духам класавай барацьбы пролетарыята — вось тыя задачы, якія ставіліся перад дзецьмі. І дзеці добра зразумелі, усвядомілі іх.

І цяпер, калі мы ўпершыню паехалі у Мінск, у сталіцу рэспублікі, паказваць сваю творчасць на Усебеларускай алімпіядзе, мы павезлі з сабой беларускія танцы, песні, мастацкіх чытачоў, спевакоў, музыкантаў—ўсё сапраўднае, красачнае дзіцячае мастацтва. Яно прасякнута свядомымі адносінамі саміх дзяцей і глыбокім разуменнем. Возьмем к прыкладу васьмігадовага Міцю Дуброўскага (Пораўскі раён). Ён чытае верш Янкі Купалы „Я —мужык беларус". Колькі праўды і цеплыні гучыць у яго голасе. Нянавісць да паноў пасычае яго змест. Або васьмігадовая Валя Здановіч (г. Брэст) спявае песню „Широка страна моя родная". Валя ніколі яшчэ не бачыла „Совецкай шырокай страны", але яна чула многа раз пра яе і ў яе дзіцячым голасе гучыць вялікая радасць, што яна цяпер з'яўляецца шчаслівай дзяўчынай шырокай совецкай краіны. І многа, многа другіх нумароў мы павезлі для цэнтра рэспублікі.

Неабходна адзначыць, што загадчык гарана тав. Барысаў да апошняга часу займаўся пытаннем гарадской абласной і рэспубліканскай алімпіяды. Што датычыць аблана, дык з боку яго не было ўважлівых адносін да алімпіяды. Намеснік загадчыка аблана тав. Іванова кіравала падрыхтоўчай работай з габінета. Яна ніводнага разу не пабывала на рэпетыцыі, а між іншым пры дапамозе рэпетыцый праводзілася вялікая творчая работа з удзельнікамі ўсіх 18 раёнаў вобласці.

**С. Д. Квіцінскі** — мастацкі кіраўнік ад Брэсцкай вобласці на рэспубліканскай алімпіядзе.

## Прыбыццё дыпламатычнай місіі Югаславіі

Сёмага ліпеня ў Маскву прыбыла дыпламатычная місія Югаславіі на чале з надзвычайным пасланнікам і паўнамоцным міністрам п. М. Гаўрыловіч.

На Кіеўскім вакзале п. М. Гаўрыловіч і члены дыпламатычнай місіі былі сустрэты загадчыкам пратакольным аддзелам НКЗО тав. В. Н. Барковым.

# ДАКУМЕНТЫ ГЕРМАНСКАЙ ШОСТАЙ „БЕЛАЙ КНІГІ"

## Аб планах нападу Францыі і Англіі на СССР і аб удзеле ў гэтым нападзе Турцыі і Іраку

### ДАКУМЕНТ № 1

БЕРЛІН, 3 ліпеня. (ТАСС). Першы дакумент шостай „Белай кнігі", перададзены Германскім інфармацыйным бюро, прадстаўляе сабой тэлеграму генерала Вейгана генералу Гамелену, галоўнакамандуючаму сухапутнымі сіламі і начальніку генеральнага штаба абароны краіны ад 7 сакавіка 1940 года. Тэлеграма гласіць: „Маршал авіяцыі Мітчэл, камандуючы авіяцыяй на Сярэднім Усходзе, які сёння ў суправаджэнні генерала Жоно на шляху ў Анкару прыбыў у Бейрут, паведаміў мне, што ён атрымаў з Лондана ўказанні адносна прыгатаванняў да магчымай бамбардыроўкі Баку і Батумі. Ён паведаміў аб сваім намеры прасіць дазволу ў генерала Чакмака зрабіць разведку аэрадромаў, размешчаных у Дыярбекіры, Эрзеруме, Карсе і... якія маглі-б служыць прамежутачнымі авіяцыйнымі базамі, галоўнай базай якіх быў-бы Джэзірэ. Маршал авіяцыі Мітчэл прасіў у мяне дазволу па ўтварэнне разведкі аэрадромаў у Джэзірэ, таму што палітычнае палажэнне Іраку, незалежнасць якога прызнана, не дазваляе без пагрозы ўскладненняў скарыстаць аэрадромы гэтай суверэннай тэрыторыі.

Я маю чэсць інфарміраваць вас, што я задаволіў жаданне маршала авіяцыі. Агляд будзе праведзен у бліжэйшы час англійскімі і французскімі афіцэрамі, якія прыбудуць у штацкім адзенні. Пры гэтым будзе створана ўражанне, што гутарка ідзе аб вывучэнні нафтаносных пластоў гэтага раёна.

Вейган".

### ДАКУМЕНТ 2

Другі дакумент шостай германскай „Белай кнігі" прыводзіць запісы Гамелена, зробленыя ім 10 сакавіка 1940 года па пытанню „аб удзеле англа-французскіх ваенных сіл у ваенных аперацыях у Фінляндыі". З пачатку ваенных дзеянняў паміж Фінляндыяй і Совецкім Саюзам, дасло́ўна сказана ў запісах, французскі і англійскі ўрады выказалі сваю гатоўнасць аказаць Фінляндыі дзейсную і хуткую дапамогу пастаўкамі авіяцыйных матэрыялаў і зброі. Першыя пастаўкі матэрыялаў пачаліся 20 снежня. Французскае вярхоўнае камандванне з свайго боку зараз-жа занялася выясненнем думкі маршала Манергейма па пытанню аб тым, у якой меры французскія ваенныя сілы, не лічачы добраахвотнікаў, могуць прыняць удзел у аперацыях. Для гэтай мэты да фінскага генералісімуса быў камандыраван капітан Ганеваль. Ён выехаў у Хельсінкі 20 снежня 1939 года і 20 студзеня 1940 года вярнуўся з Фінляндыі. Пачынаючы з 16 студзеня, французскае камандванне працавала над агульным планам узброенай інтэрвенцыі ў Фінляндыі. Гэты план прадугледжваў, у прыватнасці, высадку войск саюзнікаў у Петсамо. Адначасова належала заняць парты і аэрадромы нарвежскага ўзбярэжжа. План прадугледжваў, апрача таго, магчымае распаўсюджанне акупацыйных мерапрыемстваў на Швецыю, у прыватнасці акупацыю [illegible] Ёлівары — важнай крыніцы [illegible] руды ў Германію. Гэта-ж аперацыя мела сваёй мэтаю стварыць адначасова новую лінію сувязі праз Нарвік—Лулео. План аперацый у Петсамо, выкладзены капітанам Ганеваль, супаў з планам маршала Манергейма. У часе неафіцыяльных перагавораў з англійскім вярхоўным камандваннем, з нашай думкай згадзіліся.

У часе міжсаюзніцкіх ваенных перагавораў 31 студзеня і 1 лютага, перад пасяджэннем Вярхоўнага совета ад 5 лютага, англічане адсунулі пытанне аб непасрэднай дапамозе Фінляндыі на другі план. Яны праявілі сябе рашучымі старонникамі мерапрыемстваў, накіраваных супроць жалезных руднікоў Паўночнай Швецыі, мерапрыемстваў, якія павінны былі папутна прадпрыняты па крайняй меры ў самым пачатку ўступлення часткі ўзброеных сіл на тэрыторыю Фінляндыі. Такім чынам, яны адмовіліся практычна ад ваенных мерапрыемстваў супроць Петсамо. Ваенныя дзеянні супроць Петсамо, магчыма, насілі-б толькі папутны характар. Гэтая думка заваявала большасць у Вярхоўным совеце. Падрыхтоўка скандынаўскай экспедыцыі пачалася заразжа і англа-французскія ваенныя сілы ўжо ў першых чыслах сакавіка былі гатовы да адпраўкі. Першая група французскіх ваенных сіл (брыгада англійскіх стралкоў) 26 лютага была гатова да пакідання гарнізонаў і магла, пачынаючы з 1 сакавіка, у любы час быць пасаджана на судны. На выпадак нечаканай атакі на Петсамо, туды ўжо значна раней мог быць накіраван перадавы атрад. Кіраўніцтва намячаўшымися ў Скандынавіі аперацыямі было перадана англічанам. Французскія ваенныя сілы маглі прымаць толькі абмежаваны ўдзел у паўночных аперацыях. Французская армія была вымушана пакінуць свае галоўныя сілы на паўночна-ўсходнім фронце, дзе ёй супроцьстаялі галоўныя германскія сілы. Французская армія, апрача таго, была абавязана трымаць войскі на Альпійскім фронце і ў Паўночнай Афрыцы супроць Італіі. Французская армія трымала таксама авангарды ў Леванце.

У запісах Гамелена гаворыцца, між іншым, далей, што „стварэнне паўночнага плацдарма ваенных дзеянняў прадстаўляе з пункту погляду вядзення вайны выключны інтарэс. Незалежна ад маральных выгад, блакада будзе поўнай, а галоўнае, быў-бы закрыт доступ жалезнай руды з Швецыі ў Германію. У сувязі з гэтым, прасоўванне на Балканы, праведзенае адначасова са скандынаўскімі аперацыямі, узмацніла-б эканамічнае ўдушэнне Германіі. Германія мела-б тады толькі адзіны выхад з кальца блакады, а іменна праз яе граніцу з Расіяй. З пункту погляду ваеннага аперацыі на Балканах былі-б для Францыі куды выгаднейшы, чым аперацыі ў Скандынавіі: плацдарм ваенных дзеянняў быў-бы расшыран у вялікім маштабе. Югаславія, Румынія, Грэцыя і Турцыя прадаставілі-б нам падмацаванне роўнае, прыкладна, 100 дывізіям. Пры гэтым трэба было-б падумаць яшчэ аб нафтавых крыніцах Румыніі, якія можна было-б або абараняць, або знішчыць, і аб крыніцах Баку. Швецыя і Нарвегія маглі-б прадаставіць нам толькі слабае падмацаванне, прыкладна ў размеры 10 дывізій. Войскі, якія немцы вымушаны былі-б адцягнуць ад заходняга фронта, каб выступіць супроць нашых новых мерапрыемстваў, несумненна, сталі-б перасоўвацца ў тых-жа прапорцыях. Выгады перанясення вайны на Скандынавію ўсё-ж астаюцца неаспрэчнымі. Аднак нельга недаацэньваць тэхнічных труднасцей, якія ўзнікаюць пры такіх мерапрыемствах.

Гамелен пералічвае затым гэтыя труднасці, з якіх галоўныя ён лічыць клімат і транспарт. Чыгункі з Нарвіка і Транхейма ў Лулео, піша Гамелен, могуць служыць толькі для пазначных перавозак. Значэнне гэтых чыгунак знізіцца яшчэ больш, у выпадку прасоўвання ў Фінляндыю, бо тады можна карыстацца толькі адной чыгункай, якая пачынаецца ля Лулео і агібае Батнічаскі заліў. Аднак выкарыстанне гэтых чыгунак магчыма пры ўмове, што шведы прадаставяць нам свой чыгуначны састаў. З усяго вышэйсказанага выцякае, прадаўжае Гамелен, што ў Скандынавіі нельга было-б хутка ўвесці ў дзеянне англа-французскія ваенныя сілы. Лягчэй і хутчэй за ўсё можна дапамагчы Фінляндыі пасылкай бамбардыроўшчыкаў вялікага радыуса дзеяння. Прадпасылкай гэтаму, як і пры высадцы войск у Петсамо, павінна быць рашэнне саюзнікаў пачаць ваенныя дзеянні супроць СССР. Пасля адпраўкі матэрыялаў у Фінляндыю ў снежні месяцы дапамога Фінляндыі цяпер можа быць ажыццёўлена толькі шляхам пасылкі войск саюзнікаў. Акрамя 15.000 чалавек французскіх і польскіх войск, англічане разлічвалі паслаць яшчэ ад шасці да сямі дывізій. Па гэтаму поваду вельмі сакрэтныя весткі я атрымаў ад генерала Айронсайда. Кантынгенты войск намечаны намі. Згода ваеннага кабінета не атрымана. Агульная колькасць войск складае, такім чынам, па меншай меры 150 тысяч чалавек. Перавозка такой колькасці войск на караблях патрабуе сама па сабе значных тэрмінаў. Гутарка ідзе аб некалькіх месяцах, таму ў сучасны момант нельга прымаць рашэнняў аб павелічэнні колькасці гэтых войск. На працягу двух ці трох месяцаў становішча на французскім фронце несумненна выясніцца і мы будзем тады ў стане стварыць прадпасылкі для новых рашэнняў.

Уласнаручная прыпіска Гамелена: Мы павінны рашуча выкопваць і далей свае планы ў Скандынавіі для выратавання Фінляндыі, ці па меншай меры для захвату шведскай жалезнай руды і нарвежскіх портаў. Але мы мяркуем, што з ваеннага пункту гледжання вайна на Балканах і Каўказе, дзякуючы якой можна было-б адрэзаць Германію ад падвозу нафты, прадстаўляецца значна больш выгаднай. Аднак ключы ад Балкан знаходзяцца ў руках Італіі.

### ДАКУМЕНТ № 3

Гэты дакумент змяшчае тэлеграму Гамелена да генерала Вейгана ад 12 сакавіка 1940 года. У тэлеграме Гамелен пацвярджае Вейгану, што, па яго думцы, аперацыямі на Сярэднім Усходзе павінна кіраваць англійскае камандванне, а аперацыямі на Каўказе — турэцкае камандванне, бо гэтыя аперацыі будуць праводзіцца, галоўным чынам, турэцкімі ўзброенымі сіламі пры садзейнічанні авіяцыі і, магчыма, спецыяльных кантынгентаў саюзнікаў. Вейган „можа звязацца з маршалам Чакмаком па гэтаму пытанню і ўдзельнічаць ва ўсіх падрыхтоўчых даследваннях на Сярэднім Усходзе". Ён пасылае Вейгану праз кур'ера зводную дакладную аб дзеяннях на Каўказе.

### ДАКУМЕНТ № 4

4-ты дакумент шостай „Белай кнігі" прадстаўляе сабою тэлеграму французскага пасла ў Анкары Масілы міністэрству замежных спраў у Парыжы ад 14 сакавіка 1940 года. Тэлеграма датычыць разгавору паміж паслом Францыі і турэцкім міністрам замежных спраў аб бамбардыроўцы Баку і Батумі. Пасол не чакае ніякіх труднасцей з боку турэцкага ўрада.

Тэлеграма гласіць: „У час майго ўчарашняга наведання міністра замежных спраў, апошні па ўласнай ініцыятыве паказаў мне паступіўшую ноччу тэлеграму, у якой турэцкі прадстаўнік у Маскве паведамляе аб гутарцы з паслом ЗША. Па думцы амерыканскага пасла, рускія настолькі заклапочаны небяспекай бамбардыроўкі і пажару ў нафтавым раёне Баку, што совецкія органы звярнуліся да амерыканскіх інжынераў з пытаннем, ці можна і якім чынам загасіць пажар, выкліканы бамбардыроўкай. Інжынеры адказалі нібыта, што з прычыны прымяняўшыхся да гэтага часу спосабаў эксплаатацыі нафтавых палёў глеба настолькі насычана нафтаю, што пажар немінуча пашырыцца на ўсю суседнюю вобласць. Пройдуць месяцы, пакуль удасца загасіць пажар, і годы, пакуль можна будзе зноў арганізаваць здабычу. Што датычыць абароны насельніцтва, то з гэтай мэтаю трэба перанесці горад на 50 кілометраў ад яго цяперашняга месцазнаходжання.

Што вы скажаце на гэта? — спытаў мяне Сараджоглу. Я адказаў, што сучасныя бамбардыроўшчыкі безумоўна маюць дастатковы радыус дзеяння, каб дасягнуць Баку з Джэзірэ ці з Паўночнага Іраку. Пры гэтым неабходна будзе пралятаць праз турэцкія і іранскія вобласці.

„— Вы, стала быць, апасаецеся супярэчанняў Ірана?" — сказаў міністр. Ясней ён нічога не заявіў адносна таго, што труднасці не ўзнікнуць з боку Турцыі. Было б бястактным, калі-б я прымушаў яго выказацца дакладней. Таму я больш не кранаўся гэтага выказвання. Яно тым не менш вельмі характэрна і я дазваляю сабе, ваша прэвасхадзіцельства, спецыяльна звярнуць вашу ўвагу на гэта. Я аб гэтым паставіў у вядомасць таксама майго англійскага калегу.

Масілы".

### ДАКУМЕНТ № 5.

У дакуменце № 5 змяшчаецца план генерала Гамелена, дацірованы 16 сакавіка 1940 года, у якім разбіраецца пытанне аб стварэнні новых франтоў. Гаспадаркі Германіі і Совецкай Расіі павінны быць паслаблены шляхам спынення падвозу шведскай руды і румынскай нафты. Намерваюцца праводзіць „стратэгію знішчэння германскіх узброеных сіл". У плане вядзення вайны, складзеным галоўнай стаўкай, гаворыцца: „З прычыны таго, што палажэнні, выкладзеныя „у ваенным плане на 1940 год", астаюцца асновай нашых дзеянняў, то рэкамендуецца ў сувязі з падпісаннем руска-фінскага міру ўстанавіць, якія аперацыі можна правесці ў бліжэйшы час, каб нанесці Германіі калі не рашаючы, то адчувальны ўдар. На суды ў даны момант, відаць, вельмі цяжка дасягнуць істотных рэзультатаў. Таму трэба прымусіць Германію адмовіцца ад цяперашняй пазіцыі чакання.

Першае, што неабходна, — гэта ўзмацненне блакады. Побач з гаспадарчымі рэзультатамі, якіх можна чакаць ад гэтага мерапрыемства, трэба праследаваць мэты: 1. Магчыма, што ў інтарэсы Германіі ўваходзіць не задзяваць Галандыю і Бельгію, бо гэтыя краіны даюць Германіі магчымасць у шырокіх размерах уніхнуць уплыву блакады. Строгае кантынгентыраванне ўвозу ў Галандыю і Бельгію магло-б прывесці да таго, што Германія прадпрыме рашучыя шагі і нападзе на Бельгію і Галандыю, бо ў гэтым выпадку гэтыя краіны ў гаспадарчых адносінах прынеслі-б ёй незначную карысць.

2. Бельгію і Галандыю Германія скарыстае, галоўным чынам, для сувязі са знешнім светам, у той час, як Швецыя пастаўляе Германіі неабходную сыравіну, а іменна жалезную руду. Трэба імкнуцца спыніць гэтыя пастаўкі. Гэтага можна дабіцца, заявіўшы, што пастаўкі пэўных важных вырабаў, як, напрыклад, металавырабы, праз нейтральныя краіны, мяжуючыя з Германіяй, азначаюць прамую дапамогу і могуць прывесці да рэпрэсій. Такім чынам, Швецыя магла-б толькі пад пагрозай блакады пастаўляць Германіі жалезную руду. Таксама і Нарвегія магла-б дапусціць транзіт праз сваю тэрыторыю, падвяргаючыся такому-ж рыску. У выпадку, калі абедзве краіны падначаляцца, мэта будзе дасягнута. У працяглым выпадку трэба было-б нарушыць іх марскі гандаль. Пры такім становішчы рэчаў магло-б здарыцца, што Германія рашыла-б рэагаваць на гэта і пачала-б ваенныя дзеянні супроць Швецыі. Тады мы павінны быць гатовы да дзеянняў у адказ. Для гэтай мэты ва Францыі і Галандыі павінны быць гатовы першыя эшалоны для пасылкі ў Скандынавію, або для контратакі, або ў якасці ордку папярэджання.

3. Спыненне экспарта совецкай нафты ў Германію з Каўказа паставіла-б пытанне аб адкрыцці ваенных дзеянняў супроць СССР. Тут узнікае праблема садзеяння Турцыі гэтым мерапрыемствам, ці па крайняй меры, яе згоды на гэтыя мерапрыемствы. Штоб-б ні адбывалася па Ўсходзе, не трэба забываць пры гэтым аб пазіцыі Італіі. Як бы там ні было, але бамбардыроўка нафтавых раёнаў Баку і Батумі магла-б у значнай ступені перашкодзіць спаджэнню Германіі гаручым. Згодна планаў, намечаных у свой час, для гэтага прадназначалася дзевяць злучэнняў самалётаў. Камандванне французскім ваенна-паветраным флотам прадставіць для гэтай мэты чатыры злучэнні, астатнюю частку англійскі ваенна-паветраны флот. Гэтыя злучэнні мелі-б свае базу ў Джэзіры, дзе для гэтага ёсць падыходзячыя ўмовы. Акрамя таго павінны быць створаны базы таксама ў Азіяцкай Турцыі. Камандванне французскім ваенна-паветраным флотам магло-б ужо цяпер пачаць бамбардыроўку Закаўказзя, скарыстоўваючы два злучэнні цяжкіх бамбавозаў, якія могуць быць узмоцнены двума злучэннямі сярэдніх бамбавозаў. Гэтыя самалёты, калі абстаноўка на французскім фронце дазволіць, можна будзе ўзяць з французскага ваенна-паветранага флота. Аперацыям у паветры можна аказаць дзейснае падтрыманне:

1) Дзеяннямі ваенна-марскога флота, які павінен нарушыць суднаходства на Чорным моры. Для гэтага трэба скарыстаць у асноўным французскія і англійскія падводныя лодкі. Іх праход праз праліўы павінен прадпалагаць адкрытую ці маўклівую згоду Турцыі. Далей яны павінны скарыстаць базу на берагах Чорнага мора ў Малай Азіі.

2) Дзеянні на сушы могуць быць праведзены толькі Турцыяй і могуць быць падтрыманы некаторымі часцямі нашых войск, размешчаных у Ліване. Па настаянню Англіі Іран таксама мог-бы прыняць удзел у гэтых аперацыях.

3) Прымаючы пад увагу ўсе супярэчнасці, зробленыя па гэтаму поваду на працягу апошніх месяцаў вайны, трэба як мага хутчэй пачаць устаноўку мін у ўсіх і пачаць дзеянні авіяцыі. Такім чынам, можна часткова паралізаваць унутраны рачны транспарт Германіі. Ва ўсякім выпадку руска-фінскі мір не павінен змяніць планаў заходніх дзяржаў, намечаных на 1940 год. Гэты мір павінен пабудзіць нас дзейнічаць больш хутка і рашуча. Камбініруючы мерапрыемствы блакады з некаторымі ваеннымі аперацыямі, мы можам не толькі ўзмацніць эканамічную ізаляцыю, але і прымусіць Германію адмовіцца ад сваёй пазіцыі чакання. Вопыт шасці месяцаў вайны паказвае, што нейтральныя краіны баяцца Германіі. Не прымяняючы да іх пагроз, мы павінны ім даць адчуць нашу сілу. Зусім зразумела што дыпламатычныя і ваенныя дзеянні павінны быць аднолькава энергічнымі.

ГАМЕЛЕН".

(„Правда" ад 5 ліпеня 1940 г.).

## ВЫБАРЫ Ў ЛІТВЕ, ЛАТВІІ І ЭСТОНІІ

У сувязі з правядзеннем выбараў у новы літоўскі сейм (парламент) у літоўскім друку апублікавана выбарчая платформа „Саюза працоўнага народа Літвы" (платформа — праграма палітычнай партыі, сутнасць яе важнейшых палітычных задач). У тэксце выбарчай платформы гаворыцца:

„Грамадзяне і грамадзянкі свабоднай літоўскай рэспублікі! 14 ліпеня, згодна рашэнню нашага ўрада, па ўсёй Літве будуць праходзіць выбары ў новы сейм, які павінен будзе выразіць волю і жаданні свабоднага літоўскага народа".

Далей у платформе змяшчаецца заклік да выбаршчыкаў рашуча змагацца за наступныя патрабаванні:

У галіне знешняй палітыкі — дружба паміж народамі Літоўскай рэспублікі і Совецкага Саюза і моцны непарушны саюз Літоўскай рэспублікі з СССР.

У галіне ўнутранай палітыкі — усямерная дзяржаўная дапамога беззямельным і малазямельным сялянам, паляпшэнне становішча рабочых і служачых, поўная роўнасць нацыянальнасцей, далейшая дэмакратызацыя літоўскай арміі, свабода слова, друку, сходаў, саюзаў і іншыя.

Выбарчую платформу падпісалі прадстаўнікі ваду рабочых калектываў фабрык і заводаў, прадстаўнікі навукі, літаратуры, мастацтва, Цэнтральны Камітэт комуністычнай партыі Літвы, Цэнтральнае бюро профсаюзаў Літвы, ЦК комуністычнага саюза моладзі Літвы і іншыя грамадскія арганізацыі.

* * *

У латвійскім друку апублікавана выбарчая платформа „Саюза працоўнага народа Латвіі", а ў эстонскім друку — выбарчая платформа „Саюза працоўнага народа Эстоніі". (ТАСС).

### ПАВЕДАМЛЕННЕ АНГЛІЙСКАГА МІНІСТЭРСТВА АВІЯЦЫІ

ЛОНДАН, 7 ліпеня (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае наступнае паведамленне міністэрства авіяцыі: „Англійскія самалёты мініравалі германскія парты па Балтыйскім моры, а таксама гавані ў Вялікім і Малым Бэльце.

Ва ўсіх германскіх партах і гаванях, пачынаючы з паўночна-ўсходняй часткі Балтыйскага мора аж да Паўночнай Нарвегіі, не засталося ні аднаго ўчастка праходу для суднаў без рыска. Самалётамі ўстаноўлены міны таксама ў германскіх партах і гаванях Паўночнага мора. 12 непрыяцельскіх суднаў ужо затанулі, многа іншых пашкоджаны.

### ПАВЕДАМЛЕННЕ АГЕНЦТВА ТРАНСОЦЗАН АБ АБАРОНЧЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАХ У АНГЛІІ

БЕРЛІН, 7 ліпеня (ТАСС). Агенцтва Трансоцзан перадае, што ўчора і сёння ва ўсёй Англіі мабілізаваны дзесяткі тысяч людзей для работ па збудаванню вялікіх траншэй. Вуліцы Лондана ўчора былі запоўнены грамадзянскім насельніцтвам, якое накіроўвалася з кіркамі і лапатамі на будаўніцтва траншэй. Па распараджэнню ўлад мабілізавана таксама многа жанчын для запаўнення мяшкоў пяском.

### Прыезд Чыано ў Берлін

БЕРЛІН, 7 ліпеня (ТАСС). Сёння ў Берлін прыбыў італьянскі міністр замежных спраў Чыано. Газета „Дэйчэ альгемейне цейтунг" падкрэслівае, што Чыано „прыехаў у Берлін па прапанове германскага ўрада. Прыезд Чыано разглядваецца ў рымскіх палітычных кругах як падзея вялікага значэння."

### Распараджэнне германскіх улад ва Францыі

НЬЮ-ЙОРК, 7 ліпеня (ТАСС). Агенцтва Юнайтэд Прэс перадае, што „германскія ўлады ва Францыі аб'явілі аб строгім кантролі над эканамічным жыццём краіны ў сувязі з англійскай блакадай. Нарушэнне дэкрэтаў прыраўніваецца к сабатажу. Уводзіцца рэквізіцыя тавараў. Прадпрыемцам загадана адновіць работу на прадпрыемствах, у працяглым выпадку пагражае турэмнае зняволенне альбо штраф".

### Дэмабілізацыя французскай эскадры ў Александрыі

ЛОНДАН, 7 ліпеня (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае, што ў Александрыі адбываецца дэмабілізацыя, знаходзячайся там французскай ваеннай эскадры.

### Французскія самалёты бамбардыравалі Гібралтар

БЕРЛІН, 7 ліпеня (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае наступнае камунікэ французскага адміралцейства: „Дзве эскадрыльі французскіх самалётаў бамбардыравалі Гібралтар. Наглядання паказалі, што бомбы пападалі на знаходзячыяся ў парту англійскія ваенныя караблі".

### Французскія ваенныя караблі прыбылі ў Тулон

НЬЮ-ЙОРК, 7 ліпеня (ТАСС). Агенцтва Асошыэйтэд Прэс паведамляе, што ў Тулон прыбыў французскі лінкор „Страсбург", 5 крэйсераў, вадазмяшчэннем у 7 тысяч тон кожны, а таксама рад кананерак і падводных лодак.

### Павышэнне цэн на хлеб у Румыніі

БУХАРЭСТ, 7 ліпеня (ТАСС). У Румыніі павышана цана на хлеб на 1 лей за кілаграм.

Брэсцкаму міжрайгандлю
ПАТРАБУЮЦЦА
ДЛЯ КУРСАНТАЎ ПАКОІ
Аплата па згодзе. Звяртацца: вуліца Будзённага 57, школа № 2 тел. 5-30.

СЁННЯ Ў КІНОТЭАТРАХ

Кінатэатр „1-га МАЯ"
„БОЛЬШОЙ ВАЛЬС"

Кінатэатр імені ГОРКАГА
„ВЕСЕЛЫЯ РЕБЯТА"

### Загад аб арышце Пертынакса, Табуі, Керыліса і Бюрэ

ЛОНДАН, 7 ліпеня (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае, што ва Францыі выдан загад аб арышце чатырох выехаўшых нядаўна ў Англію французскіх журналістаў Пертынакса, Табуі, Керыліса і Бюрэ, якія абвінавачваюцца „ў распаўсюджванні хлусліва паведамленняў".

### Арышт японцаў амерыканскімі ўладамі ў Шанхаі

НЬЮ-ЙОРК, 7 ліпеня (ТАСС). Агенцтва Асошыэйтэд Прэс перадае, што амерыканскія маракі затрымалі ў амерыканскім сектары Шанхая 15 узброеных японцаў, нарушыўшых пагадненне аб забароне ўваходу на тэрыторыю амерыканскай зоны. Амерыканскія марскія ўлады ў Шанхаі заявілі, што яны не вызваляць арыштаваных, пакуль японскія ўлады не прынясуць выбачэння.

### Лік забітых і раненых у сражэнні ў Оране

НЬЮ-ЙОРК, 7 ліпеня. (ТАСС). Агенцтва Юнайтэд Прэс перадае, што у сражэнні паміж англійскімі і французскімі караблямі ў Оране забіта, ранена і загінула без вестак звыш тысячы французскіх маракоў.

### Паведамленне агенцтва Асошыэйтэд Прэс

НЬЮ-ЙОРК, 7 ліпеня (ТАСС). Агенцтва Асошыэйтэд Прэс перадае, што ў афіцыяльных французскіх кругах заяўляюць, што Германія і Італія вызвалілі Францыю ад абавязацельства раззброіць свае міжземнаморскія паветраныя і ваенна-марскія сілы.

### Аддан суду віцэ-адмірал Мюсельe

НЬЮ-ЙОРК, 7 ліпеня (ТАСС). Агенцтва Асошыэйтэд Прэс перадае, што французскае ваенна-міністэрства аб'явіла аб аддані ваенна-марскому суду члена „французскага нацыянальнага камітэта" ў Лондане віцэ-адмірала Мюсельe, па абвінавачванню ў тым, што ён „паступіў на службу англічан супроць сваёй бацькаўшчыны".

Адказны рэдактар Г. Т. МІНЧУКОЎ

ГАСТРОЛІ
ГОМЕЛЬСКАГА АБЛАСНОГА РУСКАГА
ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА
9 ліпеня Н. Пагодзін
„ПАДЬ СЕРЕБРЯНАЯ"
п'еса ў 3 дзеях. Пачатак у 9 гадзін
Каса адкрыта з 12 г. да 3 гадзін дня з 6 г. да 9 гадзін вечара.
Адкрыта гарадская каса па вуліцы Пушкінскай, вугал Комсамольскай, кіёск „Саюздруку".

Згубленым атэстаты абскавчэнні сярэдняй школы № 24 на імя Калінскай Э. М. і Менахіма Померанца лічыць несапраўднымі.

Адрас рэдакцыі: г. Брэст, вуліца імені Карла Маркса 29. Тэлефоны 1—17, 1—28.

Друкарня ім. Варашылава

Аблліт 183